аргументы, уметь решать возникающие споры и конфликты, быть ориентированными на результат, действовать в предлагаемых обстоятельствах.

*1.* Организация работы с молодежью : учеб. пособие / под ред. Е. П. Агапова, Л. С. Деточенко. – М.-Берлин : Директ-Медиа, 2015. – 738 с.

*2. Панфилова, А. П.* Игротехнический менеджмент. Интерактивные технологии для обучения и организационного развития персонала : учеб. пособие / А. П. Панфилова. – СПб. : ИВЭСЭП : Знание, 2003. – 536 с.

*3. Попова, С. Ю.* Кейс-стади: принципы создания и использования / С. Ю. Попова, Е. В. Пронина. – Тверь : СКФ-офис, 2015. – 114 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Н. В. Петухова,**
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры этналогіі і фальклору*

# ФАЛЬКЛОРНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ ЯК ПРАКТЫЧНАЯ ЧАСТКА Ў НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

Фальклорная экспедыцыя – адзін з галоўных сродкаў прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Мы рыхтуем будучых супрацоўнікаў устаноў культуры па спецыяльнасці «народная творчасць» з напрамкам «фальклор» [1], таму гэты этап іх адукацыі вельмі істотны.

У вучэбным плане кафедры прадугледжана вывучэнне дысцыплін «Вусная народная творчасць», «Фальклорны практыкум», «Этнафанічны практыкум» і іншых, якія звязаны з вывучэннем народных традыцый, а значыць патрабуюць работы з аўтэнтычным фальклорным матэрыялам. Менавіта падчас экспедыцый студэнты атрымліваюць магчымасць збіраць і працаваць з такім матэрыялам, даследаваць яго рэгіянальныя асаблівасці, такім чынам, замацоўваць атрыманыя на занятках тэарэтычныя веды і практычныя навыкі.

Студэнцкія фальклорныя экспедыцыі адбываюцца падчас вучэбнай практыкі ў другім семестры навучання. Студэнты, якія прыступаюць да фальклорнай практыкі, павінны мець

уяўленні аб побытавым паходжанні фальклору. Гэтыя ўяўленні фарміруюцца падчас вывучэння дысцыплін «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці», «Этнамузыкалогія», «Этнаграфія», «Міфалогія».

Падрыхтоўка студэнтаў да практыкі ўключае знаёмства з метадамі збора, апрацоўкі і інтэрпрэтацыі экспедыцыйных этнаграфічных матэрыялаў, сярод якіх метад палявых назіранняў (праводзіцца ў натуральных умовах, якія адрозніваюцца ад аўдыторных заняткаў), метады анкетавання, апытання носьбітаў фальклору (дапамагаюць сабраць, або ўдакладніць ужо вядомыя звесткі) і аўдыё- і відэафіксацыі.

Пасля вяртання з фальклорнай экспедыцыі сабраны матэрыял становіцца асновай для навукова-даследчай працы студэнтаў, якая звязана з упарадкаваннем фактаў для архіва, складаннем картатэкі, запаўненнем дзённіка палявой работы. Тут найбольш эфектыўным з'яўляецца дэскрыптыўны падыход, які прадугледжвае апісанне фальклорнай з'явы (стварэнне «цэласнага» этнаграфічнага тэксту) на аснове аналізу звестак, атрыманых як праз непасрэднае назіранне, так і на аснове навуковых крыніц. Затым прымяняецца класіфікацыйны падыход, які прадугледжвае першасную сістэматызацыю зафіксаваных твораў.

Вынікі сістэматызацыі захоўваюцца ў экспедыцыйнай справаздачы, якая можа ўтрымліваць не толькі пашпартныя даныя і паэтычныя тэксты фальклорных твораў, але і іх нотныя запісы, калі твор музычны. Але тут трэба ўлічваць, што традыцыйная нотная фіксацыя музычнага фальклору, асабліва песеннага, валодае як добрымі якасцямі, так і недахопамі. Без яе былі б немагчымыя даследаванні такіх элементаў музычнай тканіны, як лад, рытміка, шматгалосная фактура і інш. Але за межамі нотнага запісу часта застаюцца такія асаблівасці выканання, як тэмбр і характар гучання, спосаб гуказдабывання і іншыя элементы. Аднак для фальклору гэтыя элементы вельмі важныя: нотны запіс не ахоплівае ўсе тонкасці народнага інтанавання ў нетэмперыраваных строях. Шматлікія ўдакладняючыя мікраальтэрацыйныя абазначэнні, якія ўводзяцца рознымі фалькларыстамі, не ў поўнай меры адпавядаюць рэальнаму гучанню. Некаторыя гукі, якімі карыстаюцца фальклорныя музыканты, зусім немагчыма адлюстраваць пры дапамозе натацыі. Зрэдку прымяняюцца спецыяльныя знакі, якія аднак

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыходзіцца разгорнута каментаваць, каб апісаць тую з’яву, якую прыходзіцца кадзіраваць гэтымі знакам. Рознага роду гартанныя выкрыкі, гарлавыя прыгукі і іншыя элементы «экзатычнай» музычнай прамовы часам набліжаюцца да гукаў, якія ў еўрапейскай прафесійнай традыцыі не лічацца ўласна музычнымі і таму не маюць графічнага адлюстравання. Таму для вырашэння гэтай праблемы нотныя запісы твораў пажадана падмацоўваць арыгінальным гуказапісам [2].

Вынікі фальклорных экспедыцый абмяркоўваюцца на студэнцкіх канферэнцыях. Даклады студэнтаў прысвечаны бытаванню асобных жанраў фальклору ў пэўным рэгіёне, майстэрству таленавітых выканаўцаў, адлюстраванню мясцовай гісторыі і побыту ў фальклоры, узаемадзеянню прафесійнага мастацтва, фальклору і масавай культуры. Асаблівая ўвага надаецца ролі традыцыйных каштоўнасцей у сучаснай цывілізацыі, іх ролі ў пераадоленні крызісу ідэнтычнасці, функцыянаванню традыцыйнай культуры ў эпоху глабалізацыі, праблеме постфальклору ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыі.

Такім чынам, фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі ствараюць мэтанакіраваную сістэму далучэння студэнтаў да прафесійнай дзейнасці. Творчыя кантакты з народнымі выканаўцамі, вопыт сістэматызацыі і фіксацыі твораў вуснай традыцыі, падрыхтоўка навуковых дакладаў і справаздач ствараюць неабходны фундамент для цыклу спецыяльных дысцыплін, разнастайных эўрыстычных задач як творчага, так і даследчага плана.


*1.* Кафедра этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў : буклет / склад. В. В. Калацэй, маст. афармл. В. Красулін. – Мінск : БДУКМ, 2017. – 2 с.

*2. Петухова, Н. В.* Фальклорна-этнаграфічная экспедыцыя як сродак прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў-беларусазнаўцаў: вопыт даследаванняў абраднасці «Стралы» // «Цень Стралы: культурныя і вербальныя коды традыцыі» / склад. В. В. Калацэй, Р. М. Кавалёва. – Мінск, 2017. – С. 68–72.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ